религиозные, этнические и другие особенности. Внутренняя культура, в свою очередь, отражает систему ценностей, убеждений, норм, которые присущи определенной группе людей или обществу. Сочетание толерантности и внутренней культуры важно для создания гармоничных отношений в обществе. Если люди уважают и принимают разнообразие культур и убеждений, это способствует укреплению социальной связи, снижению конфликтов и созданию благоприятной среды для сотрудничества и взаимодействия. Любой студент должен чувствовать себя уважаемым и принятым обществом. Только толерантность и внутренняя культура создает современное инклюзивное государство.

**Литература**

1. Жукова, А. А. Профессиональная ориентация и воспитание патриотизма в высшей школе / А. А. Жукова, Я. И. Фащенко, Е. А. Федосенко // Актуальные вопросы научно-методической и учебно-организационной работы: современная система общего среднего и высшего образования как исторический фактор единства и устойчивого развития общества : сборник материалов Республиканской научно-методической конференции,– Гомель: Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины, 2022. – С. 124–127.

2. Пути повышения эффективности патриотического воспитания студентов в процессе изучения дисциплин медицинского и педагогического профиля / А. А. Жукова, Е. А. Федосенко, Я. И. Фащенко, М. В. Громыко // Современное образование: преемственность и непрерывность образовательной системы «школа - университет - предприятие» : материалы XIV международной научно-методической конференции, – Гомель: Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины, 2023. – С. 144–146.

3. Жукова, А. А. Студенческое самоуправление как эффективный способ повышения мотивации к учебе / А. А. Жукова, Е. А. Федосенко // Университетская наука: взгляд в будущее : Сборник научных трудов по материалам Международной научной конференции, посвященной 85-летию Курского государственного медицинского университета. В 2-х томах, Курск, 07 февраля 2020 года / Под редакцией В.А. Лазаренко. Том II. – Курск: Курский государственный медицинский университет, 2020. – С. 748–751.

4. Жукова, А. А. Студенческое самоуправление как важный аспект гражданско-патриотического воспитания / А. А. Жукова, М. В. Громыко, Я. И. Фащенко // Педагогика и медицина в воспитательном пространстве: проблемы, возможности и перспективы : сборник материалов Международной междисциплинарной научно-практической конференции, к 135-летию со дня рождения А. С. Макаренко, Кемерово, 10 ноября 2023 года. – RUS: федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Кемеровский государственный медицинский университет» Министерства здравоохранения Российской Федерации, 2023. – С. 178–185.

5. Фащенко, Я. И. Проблемы воспитательного процесса в современных медицинских вузах / Я. И. Фащенко, А. А. Жукова, Е. А. Федосенко // Современное образование: преемственность и непрерывность образовательной системы «школа - университет - предприятие»: материалы XIV международной научно-методической конференции,– Гомель: Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины, 2023. – С. 402–404.

***УДК 378.147:070***

***А. М. Федарава, З. У. Шведава***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## АБ АСАБЛІВАСЦЯХ ПАДРЫХТОЎКІ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ

Працэс рэфармавання журналісцкай адукацыі не закончаны і сёння, і гэта звязана не толькі і не столькі з перманентным рэфармаваннем у сферы вышэйшай школы, колькі

з першапачатковай складанасцю і неадназначнасцю канцэпцыі журналісцкай адукацыі. Мадэль журналісцкай адукацыі заўсёды з’яўлялася прадметам дыскусій як з боку метадыстаў вну, так і з боку журналістаў-практыкаў. Найбольш радыкальны з поглядаў – спецыяльная адукацыя ў гэтай сферы ўвогуле непатрэбная, таленавіты ад прыроды чалавек самастойна засвоіць азы прафесіі.

Падчас падрыхтоўкі спецыялістаў мы зыходзім з таго, што адной з найбольш значных прымет сучаснага грамадства з’яўляецца наяўнасць функцыянальнай сістэмы масавай камунікацыі. Сучасныя тэхналогіі інфармавання накіраваны на пошук аптымальных шляхоў успрымання прапанаванага для масавай аўдыторыі тэксту, што залежыць ад інтра- і экстралінгвістычнага афармлення яго і прэзентацыі ў ім камунікатыўных установак. Інфармацыйная праграма любога адрэзка маўлення складаецца з рацыянальнага, ацэначнага і прагматычнага элементаў. Тэксты публіцыстычнага стылю ўяўляюць цікавасць на тых падставах, што ўсе тры праграмы ў іх роўнай сілы, пры вядучай ролі ацэначнай, з якой вынікае прагматычная. Задача аўтара публіцыстычнага тэксту – падаць інфармацыю аб аб’ектыўным свеце такім чынам, каб мець магчымасць уплываць на чытача, што адбываецца шляхам ацэньвання суб’ектам аб’ектыўнай інфармацыі. Разнастайныя сродкі масавай камунікацыі рэпрэзентуюць тэкст як адметны від дыскурса. Увесь корпус тэкстаў масавай інфармацыі патрабуе вывучэння як своеасаблівага тыпу моўнага ўжывання, што з’яўляецца спецыфічнай сацыякультурнай дзейнасцю журналіста. Журналіст стварае форму і змест, якія гіпатэтычна зразумелыя чытачу, якія выклікаюць рэакцыі і якія ўвогуле арыентаваныя на адрасата. Структуру навін можна адэкватна зразумець толькі ў тым выпадку, калі яна аналізуецца як вынік кагнітыўнай і сацыяльнай дзейнасці журналістаў па вытворчасці тэкстаў і іх значэнняў, як вынік інтэрпрэтацыі тэкстаў чытачамі газет, якая адбываецца на аснове іх вопыту зносін са сродкамі масавай інфармацыі.

Праца журналіста па стварэнні публіцыстычнага тэксту асэнсоўваецца як творчасць, сваеасаблівы від дзейнасці – тэкставая дзейнасць. Вельмі важна, каб гэты працэс быў усвядомлены і выніковы: аўтарская задума была рэалізавана, аўтраская канцэпцыя падмацавана лагічнай сістэмай аргументаў і вывадаў, кампазіцыя дасканалая, сістэма выяўленчых сродкаў выразная. Толькі тады прагматычная праграма тэксту будзе рэалізаваная.

У праграме навучання значная ўвага павінна адводзіцца аналізу структуры навін у прэсе, пры гэтым асаблівая ўвага звяртаецца на такія глабальныя структуры, як топікі, або тэмы, і суперструктурныя схемы. Падчас глабальнага аналізу дыскурсу навін разглядаюцца структуры вышэйшых узроўняў, якія знаходзяцца за рамкамі вывучэння асобных слоў і сказаў. Студэнты павінны размяжоўваць глабальныя значэнні, што тлумачацца ў тэрмінах семантычных макраструктур, і кампазіцыйныя схемы, якія тлумачацца ў тэрмінах суперструктур. Схемы навін вызначаны з дапамогай агульнапрынятых катэгорый навін, такіх як Кароткі Змест, Галоўная Падзея і Фон, і адпаведных ім падкатэгорый. Разглядаюцца роля прынцыпаў рэлевантнасці і навізны ў структурах навін, стратэгіі фармулёўкі тэмы і схемы дыскурса навін.

У працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў звяртаецца ўвага і на псіхалогію журналісцкай дзейнасці. Псіхалагічныя механізмы ўзаемадзеяння журналістыкі і аўдыторыі; псіхалогію ўспрымання массава-інфармацыйных тэкстаў; асаблівасці псіхалогіі зносін.

Паняцце прафесійнай культуры журналіста ўключае ў сябе разам з іншымі кампанентамі лагічныя веды і звязаныя з імі навыкі лагічнага аналізу тэксту. У якасці метадалагічнай асновы для апісання разнастайных аперацый з тэкстамі разглядаецца само паняцце тэксту ў яго адносінах да мыслення і маўлення, важнае ў дадзеным выпадку пытанне аб формах фіксацыі тэксту.

Лагічныя сувязі разглядаюцца як атрыбут любога тэксту, незалежна ад яго жанравых асаблівасцей. Асноўная задача – даць навыкі лагічнага аналізу тэксту, павысіць узровень тэкставай дзейнасці будучых журналістаў.